ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (866) ● ЧАЦВЕР, 23 лістапада 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

У ГОНАР СВЯТА

У лістападзе кафедра новай і навейшай гісторыі гістарычнага факультэта (загадчык кафедры прафесар Л. М. ШНЕЕРСОН) правяла навуковую студэнцкую канферэнцыю, прысвечаную 50-годдзю СССР. Адкрываючы канферэнцыю, прафесар Г. М. Трухноў падкрэсліў, што ўтварэнне СССР з'явілася знамянальнай вяхой у жыцці ўсяго чалавецтва. Знешняя палітыка савецкай дзяржавы аказвала і аказвае дабратворны ўплыў на фарміраванне сучаснага свету, на нацыянальна - вызваленчы рух, развіццё сусветнага рэвалюцыйнага руху, на гістарычны лёс усяго чалавецтва.

З навуковымі дакладамі на канферэнцыі выступілі студэнты IV курса гістарычнага факультэта В. Анісовіч («Міжнароднае значэнне ўтварэння СССР», навуковы кіраўнік прафесар Л. М. Шнеерсон), В. Малюгін («СССР і краіны Арабскага Усходу», навуковы кіраўнік кандыдат гістарычных навук М. Г. Елісееў), студэнты V курса Г. Лазько («СССР і развіваючыяся краіны Азіі», навуковы кіраўнік дацэнт Д. С. Клімоўскі), Л. Старавойтава («Маскоўскі і Варшаўскі дагаворы з ФРГ — пачатак новага этапу мірнага суіснавання дзяржаў у Еўропе», навуковы кіраўнік дацэнт Д. С. Клімоўскі) і Н. Прыпотнеў («СССР і развіваючыяся краіны Афрыкі», навуковы кіраўнік дацэнт Д. С. Клімоўскі).

Актыўны ўдзел у рабоце канферэнцыі прымалі таксама студэнты IV і V курсаў вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта. Свае дакла-

ды прачыталі Р. А. Смольскі («СССР — магутны фактар міру»), Л. С. Захарава («СССР і краіны Лацінскай Амерыкі»), Н. В. Клестава («СССР і працэс інтэграцыі сусветнай сацыялістычнай сістэмы»); усе гэтыя даклады былі падрыхтаваны пад навуковым кіраўніцтвам старшага выкладчыка Е. А. Далгучыц.

У выступленнях удзельнікаў канферэнцыі адзначалася вялікае міжнароднае значэнне вопыту СССР у рашэнні нацыянальнага пытання, у будаўніцтве сацыялізму і камунізму. СССР, падкрэслівалася на канферэнцыі, з'яўляецца апорай міру і свабоды народаў, верным сябрам усіх прыгнечаных народаў у іх барацьбе супраць імперыялізму і каланіялізму. Савецкая знешняя палітыка на працягу ўсіх 50 год існавання СССР захоўвала вернасць ленінскім прынцыпам роўнасці, мірнага суіснавання і свабоды народаў.

Усе выступленні былі выслуханы з вялікай увагай і інтарэсам. Найбольшай змястоўнасцю і глыбінёй вызначаліся даклады Л. Захаравай, Н. Прыпотнева і Л. Старавойтавай.

В. СІНІЦА,
выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі.

Весткі з факультэтаў

журналістыкі

● Праўленне Саюза журналістаў СССР правяло вызнае расшыранае пасяджэнне усесаюзнай камісіі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы журналісцкіх кадраў.

З дакладам «Аб перспектывах развіцця журналісцкай адукацыі ў СССР» выступіў старшыня камісіі, дэкан факультэта журналістыкі МДУ Я. М. Засурскі. Аб вопыце падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у Беларусі расказаў намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ А. А. Тоўсцік.

На пасяджэнні выступілі дэканы факультэтаў, загадчыкі аддзяленняў і кафедраў журналістыкі універсітэтаў: Ленінградскага — А. Ф. Беражной, Кіеўскага — Д. М. Прылюк, Беларускага — Р. В. Булацкі, Латвійскага — Р. А. Трафімаў, Львоўскага — І. Т. Цьох, Тартускага — Ю. М. Пеегле, загадчык кафедры журналістыкі і літаратуры Мінскай вышэйшай партыйнай школы Г. Л. Напрэеў.

У спрэчках выступілі С. А. Макаускас (Вільнюскі універсітэт), В. С. Клабуцкі (Кішынёўскі універсітэт), Б. В. Стральцоў (Белдзяржуніверсітэт), Л. В. Ступніцкі (рэдактар газеты «Вільна Украіна», горад Львоў).

У рабоце пасяджэння прынялі ўдзел прадстаўнікі рэспубліканскіх журналісцкіх арганізацый, выкладчыкі факультэтаў журналістыкі вну Масквы і Мінска.

● Сустрэчы з цікавымі людзьмі — добрая традыцыя на нашым факультэце. Днямі перад студэнтамі выступілі дэканы факультэтаў журналістыкі Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага універсітэтаў — удзельнікі занальнай нарады па пытаннях падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у вну краіны.

Студэнты задавалі пытанні, на якія адказвалі дэканы. Шмат цікавага аб вучобе, адпачынку, праходжанні практыкі, размеркаванні студэнгаў расказалі Я. Н. Засурскі, А. Ф. Беражной, Д. М. Прылюк.

● На факультэце праходзіць тыдзень наведвання студэнтамі заняткаў. Яго вынікі будуць абмеркаваны на пасяджэнні камітэта камсамола.

● Кожны год на факультэце журналістыкі рыхтуецца спецыяльны выпуск насценнай газеты, прысвечаны вытворчай практыцы студэнтаў. У ёй ёсць свае пастаянныя рубрыкі: «Напісана і арганізавана намі», «Знарок не прыдумаеш» і іншыя. У сёлетнім выпуску найбольш багата прадстаўлены матэрыялы студэнта III курса В. Паўловіча і фотаздымкі студэнта IV курса В. Жука.

прыкладной матэматыкі

Цікава прайшоў вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню студэнтаў. Яго падрыхтавалі і правялі першакурснікі. Шчырымі апладысментамі сустрэлі прысутныя выступленні замежных студэнтаў, якія вучацца на ФПМ. На вечары прагучаў канцэрт, а лаўрэатам агляду мастацкай самадзейнасці — студэнтам першага курса—былі ўручаны граматы.

***

Адбылася сустрэча студэнтаў I курса са старшакурснікамі. Апошнія расказалі, як лепш арганізаваць працоўны дзень, як рыхтавацца да сесіі, падзяліліся вопытам здачы экзаменаў.

***

Паміж студэнтамі ФПМ і тэатральна-мастацкага інстытута завязаліся сяброўскія адносіны. На чарговай сустрэчы, якая адбылася нядаўна, матэматыкі расказалі аб сваёй вучобе, пазнаёмілі гасцей са стэндамі, прысвечанымі жыццю факультэта, абмяняліся сувенірамі. Спадабаўся гасцям наш вылічальны цэнтр. Новыя сябры запрасілі матэматыкаў да сябе ў інстытут.

***

Вядома ва універсітэце агітбрыгада ФПМ. У апошні час яна выступала з канцэртамі ў Слабадской школе Стаўбцоўскага і Крупіцкай СШ Мінскага раёнаў. За змястоўнас і цікавае выступленне членам агітбрыгады выказалі глыбокую ўдзячнасць і воіны.

Рэпертуар брыгады самы разнастайны: песні, танцы, прыпеўкі, вершы савецкіх паэтаў. Удзел у канцэртах прымаюць студэнты П. Матус, В. Шуманскі, Т. Засмужанец, А. Трафімчук і іншыя. Не парываюць сувязі з агітбрыгадай і тыя, хто ўжо закончыў універсітэт, — Н. Бесман, Л. Мокіна. Сёлета ў яе састаў увайшлі першакурснікі А. Гусава і Е. Бачурына. Кіруе агітбрыгадай студэнт IV курса А. Новікаў.

ЗНАЁМІМСЯ З РЭСПУБЛІКАМІ

Рыхтуючыся да слаўнай гадавіны — 50-годдзя ўтварэння СССР, на філалагічным факультэце аб'яўлен конкурс на правядзенне ў групах палітінфармацый, прысвечаных гэтай даце.

На другім курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры студэнты з цікавасцю адгукнуліся на гэтай важнай справы. Па юбілейнай тэматыцы ўжо праведзен шэраг палітінфармацый. Першая з іх была прысвечана рэспубліцы Закаўказзя. У яе правядзенні ўдзельнічала прадстаўніца Арменскай ССР, студэнтка IV курса беларускага аддзялення Лаліта Меліксіцыян. Яна расказала аб сваёй рэспубліцы, яе сувязях з іншымі брацкімі народамі, прачытала вершы армянскіх і беларускіх паэтаў на роднай мове, паказала дыяпазітывы аб Ерэване. Затым прапанавала паслухаць музыку армянскіх кампазітараў. Студэнткі В. Кедрык, Т. Кабан, Т. Крышчук падрыхтавалі выстаўку кніг аб Арменіі. А. Жыгуноў прачытаў вершы армянскіх паэтаў на беларускай мове, расказаў аб літаратурных сувязях брацкіх рэспублік, якія з кожным годам пашыраюцца. У гэтым годзе студэнт філфака армянін Ашот Габрыэлян паспяхова закончыў наш універсітэт і абараніў дыпломную работу на тэму «Творы Я. Купалы і А. Куляшова ў перакладах на армянскую мову».

Тэма другой палітінфармацыі была прысвечана РСФСР і Украіне. Прадстаўніца Украіны, студэнтка I курса рускага аддзялення Р. Алейнік расказала аб сваёй рэспубліцы. Прысутныя з цікавасцю прагледзелі дыяпазітывы аб гарадах Расіі і Украіны.

Да наступнай палітінфармацыі, прысвечанай рэспублікам Прыбалтыкі, рыхтавалася амаль уся група. Многія прачыталі адпаведную літаратуру аб гэтых рэспубліках, некаторыя раней пабывалі там самі. Актывісты запрасілі да сябе прадстаўнікоў Літвы і Латвіі, якія вучацца на журфаку, — літоўца Іонаса Лаўрынавічуса і латыша Мікалая Дэгіса. Яны расказалі аб сувязях трох брацкіх рэспублік, пазнаёміліся з паданнямі аб утварэнні некаторых гарадоў.

Напярэдадні вялікага свята на курсе будзе прачытана лекцыя «Саюз непарушны рэспублік свабодных» з паказам кінафільма, а таксама праведзена гутарка аб пісьменніках СССР — лаўрэатах Ленінскай прэміі.

У. ЛАМЕКА,
камсорг II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.



На здымках: практычныя заняткі па метадах вылічэння ў студэнтаў IV курса матфака. Іх вядзе асістэнт кафедры вышэйшай матэматыкі **А. У. Гаранкова.** Фота **Д. Чаховіча.**

У ВНУ КРАІНЫ

● У Беларускім політэхнічным інстытуце адбылася агульнасаюзная інтэрнацыянальная канферэнцыя студэнтаў інжынерных спецыяльнасцей «Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і сацыяльны прагрэс», прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР. У ёй прынялі ўдзел каля 100 замежных студэнтаў, якія вучацца ў 35 вну краіны. На шасці секцыях канферэнцыі яе ўдзельнікі зрабілі больш 100 дакладаў і паведамленняў.

● У Ленінградскім політэхнічным інстытуце імя М. І. Калініна праходзіць «Тыдзень навукі». Ён уключае ў сябе цэлы комплекс мерапрыемстваў: студэнцкія навукова-тэхнічныя канферэнцыі, лекцыі, семінары, сустрэчы. Студэнты, найлепшым чынам праявіўшыя сябе ў навуковай працы, будуць узнагароджаны дыпломамі, граматамі і прызамі розных конкурсаў.

Для ўдзелу ў «Тыдні навукі» запрошаны госці з 30 вну краіны. Яны дзеляцца вопытам навукова-даследчай працы студэнтаў, знаёмяцца з работай СНТ інстытута.

● Пры вучэбным аддзеле Мардоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Н. П. Агарова створан факультэт павышэння майстэрства выкладчыкаў і аспірантаў. У аснову заняткаў на факультэце пакладзена праграма педагогікі вышэйшай школы, распрацаваная лабараторыяй і адобраная метадычнай камісіяй універсітэта.

● Нядаўна адбылося першае ў новым навучальным годзе пасяджэнне клуба «Малады эканаміст» Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Перад студэнтамі эканамічнага факультэта з паведамленнем «Актуальныя праблемы сацыялогіі працы» выступіў лектар Усесаюзнага таварыства «Веды» Ю. Г. Борзнікаў (Масква).

● Часта, разгарнуўшы свежую газету, мы сустракаем знаёмае імя — Ефрасіння Бондарава. Гэта яна, наш таварыш-журналіст, кіназнаўца, выступіла з чарговай рэцэнзіяй на новы фільм ці з праблемным артыкулам па пытаннях мастацтва.

І ў гэты ж дзень мы можам убачыць яе ў студэнцкай аўдыторыі факультэта журналістыкі — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Ефрасіння Леанідаўна Бондарава чытае чарговую лекцыю або вядзе практычныя заняткі.

А калі празвініць апошні званок і апусцеюць аўдыторыі, Е. Л. Бондараву зноў можна ўбачыць сярод моладзі. Яна кіруе студэнцкім навуковым гуртком па праблемах публіцыстыкі.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

У 1949 годзе Е. Л. Бондарава закончыла факультэт журналістыкі. Абараніла кандыдацкую дысертацыю, працавала галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры БССР, займала іншыя адказныя пасады. Але ўвесь час яна была звязана з факультэтам журналістыкі, а з 1962 года перайшла сюды на пастаянную работу.

25 лістапада Е. Л. Бондараваі спаўняецца 50 гадоў. Любоў Вам і пашана, Ефрасіння Леанідаўна, ад студэнтаў і вашых сяброў-выкладчыкаў.

● У адной з залаў музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны гучыць радыёстужка, якая расказвае аб лагеры смерці Трасцянец, у якім загінула 205 тысяч чалавек. У апошні дзень перад бегствам фашысты расстралялі 1000 чалавек, што знаходзіліся ў лагеры. У жывых засталіся толькі трое, сярод іх Георгій Захаравіч Бягун...

27 лістапада Г. З. Бегуну, старшаму выкладчыку кафедры тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання, члену партыі, актыўнаму ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны, журналісту, спаўняецца 50 гадоў.

У 1953 годзе Г. З. Бягун закончыў універсітэт. Працаваў літаратурным супрацоўнікам, рэдактарам, фотакарэспандэнтам БелТА, выкладчыкам у тэхнікуме, прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы. З 1967 года Георгій Захаравіч — выкладчык нашага універсітэта, вядзе курс фотарэпартажа.

Г. З. Бягун выступае ў перыядычным друку з успамінамі аб вайне. Паспяхова працуе над кандыдацкай дысертацыяй. Ён узначальвае журналісцкую арганізацыю і секцыю ветэранаў вайны факультэта.

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя студэнты і выкладчыкі факультэта журналістыкі шлюць Вам, Георгій Захаравіч, самыя цёплыя віншаванні і пажаданні добрага здароўя, плёну і поспехаў ва ўсіх справах, бадзёрасці і вечнай маладосці.

УЛІЧВАЦЬ ІНТАРЭСЫ КОЖНАГА

Часта можна чуць, як групкамсоргі першых курсаў скардзяцца на цяжкасці ў рабоце, недахоп часу. Як трэба арганізаваць і наладзіць работу пачынаючаму камсоргу, на што абапірацца, дзе знайсці дапамогу і падтрымку, з кім параіцца? Магчыма, першакурснікі знойдуць адказы на некаторыя з гэтых пытанняў у нашай размове з камсоргам 5 групы III курса фізічнага факультэта Святланай Боршч, адной з лепшых на факультэце.

— Скажыце, Святлана, ці даўно вы займаецеся камсамольскай работай?

— Яшчэ ў школе я была сакратаром камітэта камсамола, а з першага курса — групкамсорг. Дарэчы, і камсамольскае бюро нашай групы засталося амаль нязменным з першага года вучобы.

— У сувязі з гэтым ці не лічыце вы, што арганізацыі паспяховай работы ў групе ў значнай меры дапамагае дзейснасць камсамольскага бюро?

Так. У сваёй рабоце камсорг перш за ўсё абапіраецца на бюро. Я, напрыклад, ніколі не адчувала моцнай загружанасці, ніколі не «цягнула лямку» адна, таму што вялікую работу вядуць усе члены нашага камсамольскага бюро. Акрамя таго, ад іх актыўнасці, непасрэднай сувязі з камсамольцамі залежыць, ці будзе работа ў групе цікавай. Таму нельга, каб у бюро пападалі выпадковыя людзі. Лепш, калі ў яго састаў увойдуць тыя, хто ўжо мае вопыт камсамольскай работы. А для гэтага трэба, каб выбары ў бюро праходзілі праз месяц — паўтара пасля пачатку вучобы. За гэты час рабяты ўжо пазнаёмяцца, бліжэй пазнаюць адзін аднаго. Камсамольскае бюро нашай групы было выбрана пасля месяца работы на ўборцы бульбы. Таму наша бюро аказалася актыўным і больш двух год паспяхова вядзе работу ў групе.

— Што трэба рабіць, каб камсамольская работа ў групе была сапраўды цікавай?

— Перш за ўсё—улічваць інтарэсы, запатрабаванні камсамольцаў. План камсамольскай работы павінен складацца з улікам пажаданняў членаў групы, у яго трэба смела ўносіць іх дапаўненні, змяненні. Так робіцца ў нашай групе. У сваёй рабоце камсорг павінен падтрымліваць цесную сувязь са старастай групы, весці работу сумесна. Гэта мы і стараемся рабіць з Валянцінай Ярмольчык. Хачу параіць пачынаючым камсоргам не баяцца звяртацца за дапамогай да куратара групы, у камітэт камсамола факультэта, дзе заўсёды дадуць карысную параду, акажуць практычную дапамогу.

— А калі камсорг усё ж не змог наладзіць кантакту з бюро і камсамольцамі групы?

— Я лічу, што такому чалавеку лепш было б пакінуць пасаду камсорга. Наша ж работа заснавана перш за ўсё на ўзаемаразуменні камсорга і групы. «Сценка» паміж мной і групай?.. Не, ніколі не адчувала яе. І наогул, мне думаецца, мы знайшлі з групай агульную мову.

— Ці сутыкаліся вы з фармальнасцямі ў камсамольскай рабоце?

— На жаль. І тлумачыцца гэта тым, што нярэдка ўся работа вядзецца дзеля «галачкі» ў плане. Камсорг і бюро не могуць тады па-сапраўднаму зацікавіць камсамольцаў, уцягнуць іх у работу. Ці можна пазбегнуць фармальнасцей? Бясспрэчна. Узяць хоць бы камсамольскія сходы. Часта яны праводзяцца па загадзя намечанаму «сцэнарыю»: усе выступленні размеркаваны, і, акрамя тых, хто загадзя ўнесен у спіс выступаючых, у рабоце сходу практычна ніхто не ўдзельнічае. А ў нас у групе камсамольскія сходы даўно перайшлі ў дзелавыя дыскусіі. Яны праходзяць проста, без лішняй напружанасці і афіцыйнасці, кожны мае права выказаць сваю думку па таму ці іншаму пытанню, і многія робяць гэта.

— І апошняе пытанне. Ці не перашкаджае камсамольская работа вучобе?

— Ніколькі. Праўда, на першым курсе было цяжкавата: усё новае, незнаёмае, да ўсяго трэба прывыкнуць. А зараз я не адчуваю ніякіх перашкод у вучобе і нават пішу навуковую працу. Свабодны час пры жаданні заўсёды можна знайсці. Галоўнае—правільна размеркаваць яго. Я не лічу, што быць камсоргам вельмі цяжка, і думаю, што ўсе пачынаючыя камсоргі пры жаданні могуць добра наладзіць работу ў сваіх групах.

Гутарку вялі
В. ЛЯЛЕКА,
А. АСТРОЎСКІ.



Студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя. Студэнт-вячэрнік III курса аддзялення радыёфізікі А. І. Лапенка за наладкай апаратуры, неабходнай для даследаванняў.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ДЫСЕРТАЦЫЙ

Зацверджана новая інструкцыя аб парадку прысуджэння вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў.

Выданне новай інструкцыі, якая ўступіла ў сілу з 1 верасня гэтага года, прадыктавана неабходнасцю паляпшэння якасці атэстацыі навукова-педагагічных кадраў, павышэння патрабавальнасці да ўзроўню навуковай падрыхтоўкі тых, хто рыхтуецца атрымаць вучоную ступень ці званне.

Што новага ў гэтай інструкцыі?

Перш за ўсё, строга абмежаван аб'ём дысертацый, якія ў мінулым часта былі многаслоўнымі, адымалі многа часу ў апанентаў і экспертаў.

Цяпер аб'ём доктарскай дысертацыі не павінен перавышаць 300 старонак, а кандыдацкай — 150. Па гуманітарных навуках дапускаецца павелічэнне на 20—30 працэнтаў. Малюнкі, схемы, графікі, спісы літаратуры і г. д. у гэты аб'ём не ўваходзяць.

Адменена публікацыя ў газеце аб дні абароны. Некаторыя змены адбыліся ў здачы кандыдацкага мінімуму. Так, напрыклад, асобы, якія абараняюць дысертацыі па эканамічных навуках, абавязаны здаваць дадатковы экзамен па палітэканоміі капіталізму і сацыялізму.

Абмежавана колькасць вучоных саветаў, у якіх адначасова можа быць членам той ці іншы навуковы работнік.

Уведзена новае палажэнне аб пазбаўленні ступеней і званняў асоб, якія дапусцілі амаральныя, антыпатрыятычныя і іншыя ўчынкі, несумяшчальныя са званнем вучонага.

Асаблівыя патрабаванні ўстаноўлены для дактароў навук, якія працуюць у навукова-даследчых інстытутах і прэтэндуюць на званне прафесара.

Павялічан тэрмін разгляду дысертацыі ў ВАКу: доктарскіх — да 10 месяцаў, кандыдацкіх — да 5 месяцаў.

Інструкцыя аб парадку прысуджэння вучоных ступеней і прысваення вучоных званняў складаецца з раздзелаў: аб асобах, якія маюць права на вучоныя ступені; аб парадку прысуджэння вучоных ступеней; аб патрабаваннях да дысертацый (работ, падручнікаў), якія прадстаўляюцца да абароны на атрыманне вучоных ступеней; аб кандыдацкіх экзаменах; аб саветах па прысуджэнню вучоных ступеней; аб парадку прадстаўлення і абароны дысертацый; аб асобах, якія маюць права на вучоныя званні; аб парадку зацвярджэння вучоных званняў; аб парадку пераатэстацыі і настрыфікацыі вучоных ступеней, атрыманых грамадзянамі СССР у замежных краінах; аб дакументах, выдаваемых асобам, якія маюць вучоныя ступені і званні; парадак абскарджання рашэнняў саветаў і Вышэйшай атэстацыйнай камісіі і парадак пазбаўлення вучоных ступеней і званняў.

С А СВЯТАМ!

22 лістапада 1943 года ў выніку росту нацыянальна-вызваленчага руху французскія акупанты былі вымушаны прызнаць законнае права Лівана на суверэнітэт.

Гэты дзень — Дзень незалежнасці — стаў нацыянальным святам Лівана.

Савет дружбы універсітэта віншуе прадстаўнікоў гэтай краіны, якія вучацца ў БДУ, і жадае ім вялікіх поспехаў у працы, вучобе і асабістым жыцці.

* * *

26 лістапада — Дзень абвяшчэння Манголь-скай Народнай Рэспублікі. У нашым універсітэце на кафедры фізікі займаецца група мангольскіх аспірантаў і стажораў. Савет дружыны віншуе мангольскіх сяброў з надыходзячым святам і жадае ім вялікіх поспехаў.

САВЕТ ДРУЖБЫ УНІВЕРСІТЭТА.

З ДОБРЫМІ ЎРАЖАННЯМІ

ЦЕСНЫЯ сяброўскія сувязі ў Беларускага дзяржаўнага універсітэта з універсітэтамі краін народнай дэмакратыі. Летам — абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі, зімой — турысцкія паездкі, гастролі калектываў мастацкай самадзейнасці. Так, у мінулым годзе наш ансамбль «Крыжачок» выязджаў з канцэртамі ў Балгарскую Народную Рэспубліку. А ў гэтым годзе з візітам у адказ прыехаў ансамбль танца Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага. Разам з ансамблем у БДУ прыбылі сакратар камітэта камсамола ДКМС універсітэта Іван Дамянаў і загадчык кафедры дзяржаўнага будаўніцтва прафесар Георгій Кастадынаў.

Першы канцэрт, які прайшоў з вялікім поспехам, нашы сябры паказалі для студэнтаў БДУ. Затым—паездка ў Жодзіна. З радасцю сустракалі работнікі БелАЗа балгарскіх сяброў. Зала была перапоўнена. У знак падзякі рабочыя падарылі ансамблю сувеніры і памятныя значкі.

Цікавай была праграма знаходжання балгарскіх студэнтаў у Беларусі. Экскурсіі па Мінску, у сталіцу Літоўскай ССР горад Вільнюс, паездка ў Хатынь і на Курган Славы. Культпаходы ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у Дом-музей І з'езда РСДРП, у тэатр оперы і балета, выступленні з канцэртамі ў Доме афіцэраў, у падшэфнай воінскай часці.

Напярэдадні ад'езду на радзіму балгарскія студэнты падзяліліся сваімі ўражаннямі аб знаходжанні ў Беларусі.

— Скажыце, калі ласка,— запытала я ў Андрыяны Цяфгіевай, — якое выступленне вашага ансамбля Вы лічыце найбольш удалым?

Яна крыху падумала, а затым адказала:

— Гэта, напэўна, канцэрт у саўгасе «Любань». Рабочыя гэтага саўгаса вельмі чакалі нас. Выступалі мы перад самым святам — 6 лістапада, настрой ва ўсіх быў прыўзняты. Усё гэта і дапамагло нам выступіць вельмі добра.

— І самае яркае ўражанне вашай паездкі?

— Свята 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, ваенны парад і дэманстрацыя працоўных горада Мінска 7 лістапада.

Да нас падышло яшчэ некалькі ўдзельнікаў ансамбля, і пачалася размова аб Балгарыі, аб дружбе двух універсітэтаў — Беларускага і Сафійскага, аб канцэртах, планах.

Праз некалькі дзён ад'язджалі госці дадому, везучы з сабой цёплыя ўспаміны аб беларускай зямлі.

І. МАЗУРКЕВІЧ.

ДЗЕНЬ ЗАВОЧНІКА



У канцы мінулага тыдня прайшоў чарговы дзень завочніка. Многія студэнты датэрмінова здалі залікі і экзамены і гэтым самым пазбавілі сябе перагрузкі ў зімовую сесію.

НА ЗДЫМКУ: экзамен па педагогіцы ў студэнтаў IV курса аддзялення гісторыі завочнага факультэта прымае ст. выкладчыца кафедры педагогікі і псіхалогіі З. М. ЦІТОК.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

РАСКАЗВАЕ ЎДЗЕЛЬНІК АЛІМПІЯДЫ

20 лістапада на геаграфічным факультэце адбылася сустрэча з другім сакратаром ЦК ЛКСМБ Вячаславам Радомскім, які падзяліўся сваімі ўспамінамі аб XX Алімпійскіх гульнях.

У саставе савецкай дэлегацыі ён наведаў многія гарады, гістарычныя месцы, буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы Баварыі, пабываў у былым канцлагеры Дахау.

Студэнты падзякавалі госцю за цікавы расказ і паднеслі яму кветкі.

Н. НОВІКАВА.

ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

На II курсе геафака адбылася сустрэча студэнтаў са старэйшай камуністкай, удзельніцай грамадзянскай вайны, вучаніцай Н. К. Крупскай Аленай Анатольеўнай Мар'ясінай.

Перад намі пажылая, але яшчэ даволі рухавая і энергічная жанчына, якая прайшла нялёгкую дарогу жыцця. Яе біяграфія поўная подзвігаў і жыццёвай сілы. У 1918 годзе страціла бацькоў, чатыры гады выхоўвалася ў воінскай часці. А. А. Мар'ясіна ўдзельнічала ў арганізацыі першых камун. Пасля грамадзянскай вайны вучылася на рабфаку ў Ленінградзе.

Госця расказала студэнтам аб непаўторнай адвазе першых чырвонаармейцаў, аб іх самаадданым імкненні адстаяць родную Савецкую ўладу. З болем успамінае Алена Анатольеўна аб сваіх рабаявых таварышах, якія загінулі ад кулацкіх куль. Слухаючы яе расказ, мы знаёміліся з рабфакаўскай моладдзю, загартаванай у барацьбе, гарэўшай імкненнем вучыцца.

У заключэнне Алена Анатольеўна ад імя старэйшага пакалення заклікала студэнцтва берагчы заваёвы бацькоў, быць адданымі партыі, народу, Радзіме, пажадала поспехаў у вучобе.

Студэнты горача падзякавалі А. А. Мар'ясінай за цікавы расказ і ўручылі ёй памятны падарунак і кветкі.

А. АПАНАСЁНАК.

ТРЫ ДНІ Ў ГОРАДЗЕ НА НЯВЕ

Калі ў мінулым годзе наша група вярталася з экскурсіі ў Брэст, ужо тады, у купэ цягніка, быў вызначан маршрут новай паездкі — горад Ленінград.

...«АН-24» лёгка адарвaўся ад бетоннай паласы, і пад намі паплылі агні роднага Мінска. Знаёмыя вуліцы і праспекты здаваліся светлымі лінейкамі, па баках якіх іскаркамі свяціліся вокны дамоў. Самалёт хутка набіраў вышыню. За нізкімі воблакамі схаваліся апошнія зямныя агні, а вакол самалёта загарэлася мноства зораў, нібы ў ясную марозную ноч.

Гаворка, смех скрадвалі час палёту. «Я бачу Ленінград!» — усклікнуў хтосьці, і мы ўсе прыпалі да ілюмінатараў. Спачатку паказаліся асобныя агеньчыкі, а потым роўныя ланцужкі святла акрэслілі вуліцы і плошчы горада-героя. Толькі адна вуліца здалася мне занадта шырокай. «Дык гэта ж Нява!» — здагадаўся я, прыкмеціўшы адбітак набярэжных ліхтароў на вадзе.

Вечарам мы паспелі азнаёміцца з Ленінградскім метрапалітэнам: да месца, дзе мы намерваліся прыпыніцца, дабіраліся на падземных электрычках.

Часовым домам для нас стаў інтэрнат Ленінградскай партыйнай школы, які размешчан ля самага Смольнага. Такім суседствам кожны з нас ганарыўся, а пакоі, у якіх нас размясцілі, былі надзвычай добраўпарадкаваны.

Дзень першы. Раніцай ішоў мокры снег. Можа таму, што было блізка мора. Аднак такое надвор'е восенню і ў Мінску не рэдкасць. Хуценька перакусілі і, не зважаючы на слоту, накіраваліся ў Эрмітаж.

Я не збіраюся перадаваць пачуцці, якія ахопліваюць у дзівосных пакоях Зімняга пałаца. Тут проста трэба пабываць самому. Прыгадаю толькі адно.

У адным пакоі Эрмітажа экспануецца складзеная з прыродных мінералаў карта Савецкага Саюза. Калі я зайшоў у гэты пакой, там была дэлегацыя іншаземцаў. Дзяўчына-экскурсавод, як я зразумеў, расказвала пра шматнацыянальны састаў нашай Радзімы, яе веліч і гераізм, бо словы Масква і Адэса, Брэст і Уладзівасток, Шушанскае і Сталінград гучаць аднолькава на ўсіх мовах.

Гэты дзень абяцаў нам і экскурсію па горадзе. Ад дома да дома, з вуліцы на вуліцу, з востраў на востраў перавозіў нас аўтобус, і мы крочылі па гісторыі: прысутнічалі пры закладцы першых дамоў, разам з Пятром І глядзелі на хвалі Нявы, з прыгоннымі сялянамі ўзводзілі цуда-палацы, бурлілі ў натоўпе на Сенацкай плошчы і на Фінляндскім вакзале, грэліся з салдатамі рэвалюцыі ля кастроў перад рашаючым штурмам, адчулі блакаду і, калі аўтобус выскачыў на шырокія праспекты сучасных мікрараёнаў, убачылі, што Ленінград яшчэ і малады.

Дзень другі. Мы ступілі пад велічныя купалы Ісакіеўскага сабора. Архітэктура, карціны, кераміка, фрэскі здзіўлялі сваёй прыгажосцю. Хацелася стаць на калені і пакланіцца, але не святым лікам, а рускім майстрам, якія пакінулі нашчадкам непаўторны помнік. Дзякуючы маятніку Фуко, які раскачваецца пад купалам галоўнага храма Расіі, ён стаў месцам, дзе пахавана адна з асноў царкоўнага дурману: сцвярджэнне, што зямля не верціцца вакол сваёй восі.

Затым з Дварцовай плошчы мы адправіліся на экскурсію па месцах, звязаных з жыццём А. С. Пушкіна. Летні сад і Кіеўскі праспект, старыя будынкі, дзе сустракаўся паэт са сваімі сябрамі, апошняя кватэра і Чорная рэчка берагуць памяць аб геніі рускага народа.

Кожны, хто любіць тэатр, марыць пабываць у адным з лепшых тэатраў Савецкага Саюза — Ленінградскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічным Вялікім драматычным тэатры імя М. Горкага. Задоўга да паездкі мы спрабавалі звязацца з тэатрам, але жадаючых пабываць там столькі, што на пісьмо дырэкцыя нават не адказала. І ўсё ж нашы жаданні збыліся: знаходлівасць дапамагла дастаць білеты на вячэрні спектакль. У п'есе «Месяц для пасынкаў лёсу» мы сустрэліся з вядомымі артыстамі Капелянам і Ціханавым.

Дзень трэці. Учарашняя экскурсія па пушкінскіх месцах настолькі нас захапіла, што мы рашылі наведаць кватэру-музей Пушкіна на Мойцы.

Але ў першую чаргу навэжваліся пабываць у Ленінградскім універсітэце і, зразумела, на факультэце журналістыкі. У нашых калег ішлі заняткі. Мы сур'ёзна ацэньвалі насценны друк, афармленне факультэта і па-дзіцячаму імкнуліся заглянуць праз прыадчыненыя дзверы ў аўдыторыі. Каб трапіць на лекцыі, у нас не было часу. Адразу ж з універсітэта мы накіраваліся на другі бераг Нявы, на апошнюю кватэру Пушкіна.

У другой палове дня нам паказаў свае багацці Рускі музей. А позна вечарам мы развітваліся з дзівосным горадам, які назаўсёды застаўся ў нашай памяці.

Я і мае таварышы вельмі ўдзячны куратару Азе Аляксееўне Плаўнік, якая арганізавала для нас гэтую карысную і захапляючую паездку.

А. САПЁРАЎ.

Нядаўна выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў арганізавалі экскурсію на Радзіму Якуба Коласа — у Мікалаеўшчыну.

НА ЗДЫМКУ: успамінамі дзеліцца брат пісьменніка — цяпер дырэктар яго музея — Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч.

Фота *У. Белакосава.*

НАВУКА І ТЭХНІКА.

ДЗІЎНАЕ ШКЛО

Часта можна пачуць такое параўнанне: крохкі, як шкло. Да некаторай пары гэта было ісцінай, не выклікаўшай сумнення. А цяпер...

— Біце! Мацней! Яшчэ раз! — раздаецца голас экскурсавода ў павільёне «Фізіка» ВДНГ. Па зале разносіцца частае рэха. Але ліст тонкага шкла, па якому б'е малатком адзін з наведвальнікаў, застаецца цэлым і непашкоджаным.

— Разбіць гэтае шкло можна толькі ударам сілай у 600—700 кг, — гаворыць экскурсавод.

Глядзіш і міжволі здзіўляешся. Ляжыць звычайнае аконнае шкло — тонкае, празрыстае, а вытрымлівае такія вялікія нагрузкі. Выраблена гэтае шкло спецыялістамі Фізіка-тэхнічнага інстытута імя А. Ф. Іофе. Тэхналогія яго вырабу мала чым адрозніваецца ад тэхналогіі вытворчасці аконнага шкла. Толькі гэтае шкло спачатку травяць едкай плавікавай кіслатой, а пасля пакрываюць тонкім слоем спецыяльнага лаку. Гэта і забяспечвае яму такую высокую трываласць (ударная сіла звычайнага шкла — 20 кг на 1 кв. м).

КВЕТКІ ЗА ГУМАР І ШЧЫРАСЦЬ

І няхай гэтая сустрэча дапаможа яшчэ больш замацаваць сяброўскія сувязі паміж нашымі універсітэтамі!

Так закончыў старшыня прафкома БДУ М. Дрозд сваё прывітальнае слова студэнцкаму эстраднаму тэатру мініяцюр Калінінградскага дзяржаўнага універсітэта.

Гучыць музыка.

На сцэне — юнакі і дзяўчаты ў жоўтых кашулях. Гэта самадзейныя артысты. Выйшлі, загаварылі — і на ўвесь час прыкавалі да сябе ўвагу гледачоў.

Невялікая гумарыстычная сцэнка — здаюць экзамен пачаргова трое студэнтаў: «нясмелы», «нахабны» і «нармальны». «Нясмелы» сваёй баязлівасцю, дрыжыкамі ў каленках і ў голасе вымушае выкладчыка паставіць яму запаветную «тройку». «Нахабны» дзейнічае інакш — уганяе ў дрыжыкі самога экзаменатара, і той з радасцю (ах, нарэшце адкараскаўся!) ставіць «выдатна». «Нармальны» бярэ сваёй знаходлівасцю... А выканаўцы В. Ягораў і А. Бубенік падкупліваюць залу гумарам і дарам пераўвасаблення.

Трапныя мініяцюры — адна за другой. Мы бачым студэнцкае жыццё (увогуле аднолькавае як у Калінінградскім, Беларускім, так і ў іншых навучальных установах) з заліковымі кніжкамі, экзаменамі, «чытałкамі»...

— Перамена дэкарацый! — аб'яўляе адзін з хлопцаў.

Артысты хаваюцца за кулісамі, а ля мікрафонаў — вакальна-інструментальны ансамбль. Льюцца ў залу гукі флейты, гітары, ударных. Сола выконвае кіраўнік ансамбля В. Анісімаў. Пасля спявае Ірына Букалава. Гучыць задорная народная песня «Міленькі ты мой»...

Жыццярадаснасць студэнцкіх год, іх непаўторнасць, шматграннасць цудоўна змаглі перадаць на сцэне кіраўнік студэнцкага тэатра А. С. Міхайлаў, М. Снапір, В. Трусава, В. Трубій і іншыя ўдзельнікі канцэрта. І як узнагарода за іх выступленні — кветкі, апладысменты ўдзячных гледачоў.

У. ГРЭЎЦАЎ.



Спорт

ПЕРАМАГАЮЦЬ МАЦНЕЙШЫЯ

● 18—19 лістапада жаночая баскетбольная каманда універсітэта змагалася за выхад у паўфінал розыгрышу кубка БССР з камандай Гомельскага універсітэта.

Нашы баскетбалісткі першую сустрэчу выйгралі з лікам 58:49, другую — 61:59.

25—26 лістапада ў Віцебску пройдуць паўфінальныя гульні, дзе спартсменкі БДУ сустрэнуцца з камандай Віцебскай вобласці.

● У гэтым годзе званне майстра спорту атрымалі Анатоль Данілевіч (класічная барацьба), Міхаіл Жыцянёў (цяжкая атлетыка), Сяргей Сахадзе (самба), Аляксандр Скрыпічнікаў (бокс) і іншыя.

Майстрам спорту па лёгкай атлетыцы стала студэнтка гістфака, кандыдат у члены зборнай СССР Людміла Кайгародава (скачкі ў даўжыню).

● Падведзены вынікі XV спартакіяды БССР. Зборная каманда БДУ засталася на IV месцы, але лік ачкоў у параўнанні з мінулым годам павялічыўся на 800.

Першае месца заняла каманда жанчын па баскетболу, 2-е — цяжка- і лёгкаатлеты, 3-е — каманды па мастацкай гімнастыцы і настольнаму тэнісу.

● Паляпшаецца спартыўная база БДУ. Адкрыта новая спартыўная зала ў корпусе геаграфічнага факультэта, дзе будуць займацца штангісты. У наступным сезоне змогуць карыстацца добрай бегавой дарожкай і сектарамі лёгкаатлеты. Каля 1000 пар лыж чакаюць гэтай зімой аматараў лыжнага спорту.

● Каля 3.500 студэнтаў удзельнічала ў асеннім спартыўным кросе. Пераможцам стаў біялагічны факультэт. Другое і трэцяе месцы занялі красмены гістфака і факультэта прыкладной матэматыкі.

Т. ЗАСІМ.

ПА ПРАГРАМЕ ГПА

На факультэце журналістыкі паявіўся стэнд з нормамі па відах спорту, «Палажэннем аб усесаюзным фізкультурным комплексе «Гатоў да працы і абароны СССР». Стэнд адлюстроўвае і ход здачы норм ГПА.

Ужо нядрэнна паказалі сябе першакурснікі. Усе яны былі ўдзельнікамі асенняга кросу і выканалі нормы ГПА. А нядаўна на факультэце было праведзена першынства па лёгкай атлетыцы. І зноў першае месца занялі студэнты першага курса. Таня Агеева, якая скокнула на 405 см, і Мікалай Шчэрба з часам 3 хвіліны ў бегу на 1000 метраў устанавілі першыя рэкорды факультэта. Парадаваў вынікам у бегу на 100 метраў студэнт III курса Міхаіл Харытонаў. Яго вынік 11,8 сек.

Аб гэтых спаборніцтвах расказала фотагазета. А ў час тэлеперадачы, якую падрыхтаваў трэці курс, старшыня камісіі па здачы норм ГПА дэкан факультэта Р. В. Булацкі ўручыў пераможцам граматы.

СТУДЭНЦКІЯ ДЫЯЛОГІ

ГУМАР.

— Чаго вы хвалюецеся? — пытае прафесар студэнта. — Няўжо вы баіцеся маіх пытанняў?

— Зусім не,—адказвае той.—Я баюся сваіх адказаў.

●

У аўдыторыю, дзе праходзіць экзамен, забягае студэнт.

— Пастаўце мне двойку, прафесар, і я пайду.

— Паслухайце, паважаны, я вас не апытваў, як жа я магу паставіць нездавальняючa?

— Я прашу вас, пастаўце.

— А можа вы ведаеце на большае? Я не магу вам паставіць двойку.

— Прафесар, і ўсё ж...

— Не і не!

— Ну, добра, угаварылі! Стаўце тады тройку.

●

Прафесар: — Нічога з вас, дарагі, не атрымаецца... А вось Аляксандр Македонскі ў вашыя гады пакарыў палову вядомага тады свету.

Студэнт:—Дык у яго ж настаўнікам быў Арыстоцель!..

●

— Скажы, як геолаг, калі твае пощукі былі самымі безнадзейнымі?

— Калі я шукаў у ведамасці студэнцкіх стыпендый сваё прозвішча.

●

— Паслухайце, вы ўжо трыццаць мінут стаіце ля дошкі і не можаце растлумачыць закон Фарадэя.

— Не падганяйце мяне, калі ласка. Нават сам Фарадэй затраціў на гэты закон некалькі год.

●

Прафесар:—Вазьму грэх на душу, пастаўлю вам тройку.

Студэнт:—Стаўце тады чацвёрку, абодва возьмем па граху.

ВЫЙШЛІ Ў ВЫДАВЕЦТВЕ БДУ

В. Ф. Беркаў. «Пытанне як форма думкі». (На рускай мове).

Пытаннем як формай думкі цяпер цікавяцца прадстаўнікі самых разнастайных галін навукі і перш за ўсё педагогікі. Такая ўвага дыктуецца тэарэтычнай і практычнай неабходнасцю, сучасным узроўнем навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У кнізе разглядаецца логіка-гнасеалагічная прырода пытанняў, іх структура і ўзаемасувязь з адказамі. Закранаюцца і такія праблемы, як моўныя сродкі фармуліроўкі пытанняў, тыпы адказаў і г. д.

Дапаможнік рэкамендуецца выкладчыкам вну і школ, аспірантам, студэнтам і навуковым работнікам.

Т. П. Багданава. «Праца і сацыяльная актыўнасць моладзі». (На рускай мове).

Прыцягнуць увагу чытачоў да праблем фарміравання сацыяльнай актыўнасці рабочай моладзі ў працэсе працоўнай дзейнасці — галоўная мэта манаграфіі. На аснове вынікаў канкрэтнага сацыялагічнага даследавання аўтар паказвае важнейшыя напрамкі фарміравання актыўнасці рабочай моладзі ў працы ва ўмовах камуністычнага будаўніцтва, уплыў спецыфічных аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў вытворчай дзейнасці ў працоўных калектывах на інтэнсіўнасць гэтага працэсу.

Кніга адрасуецца студэнтам і выкладчыкам вну, партыйным і камсамольскім прапагандыстам.

Ю. А. Харын. «Дыялектыка сацыяльнага адмаўлення». (На рускай мове).

Аўтар даследуе адну з малараспрацаваных у нашай літаратуры праблем дыялектыкі грамадскага працэсу — дыялектыкі сацыяльнага адмаўлення: як фарміруецца ідэя адмаўлення, які механізм пераходу ад крытыкі да практычнага дзеяння адмаўлення, асаблівасці адмаўлення пры сацыялізме. На гэтыя і іншыя пытанні чытач знойдзе адказ у кнізе. Значнае месца адводзіцца праблеме нігілізму як сацыяльнай з'явы, крытыцы антымарксісцкіх канцэпцый грамадскага прагрэсу.

Л. А. Паўловіч, А. Я. Малышаў. «Прамысловасць Мінска». (На беларускай мове).

У эканоміка-геаграфічным нарысе аўтары ў папулярнай форме расказваюць аб мінулым і сучасным Мінска, паказваюць бурнае развіццё яго прамысловасці. Вялікая ўвага ўдзелена эканамічным сувязям беларускай сталіцы з буйнейшымі раёнамі краіны, а таксама зарубежнымі дзяржавамі.

Багаты фактычны матэрыял, сабраны ў кнізе, карысным будзе для прапагандыстаў, палітінфарматараў, агітатараў, эканамістаў, географаў, работнікаў планавых арганізацый.

«Зборнік нарматыўных актаў па савецкаму грамадзянскаму праву». Складальнік В. Ф. Чыгір. (На рускай мове).

У зборніку змешчаны нарматыўныя акты па савецкаму грамадзянскаму праву, найбольш важныя законы СССР і БССР, загады, інструкцыі і іншыя нарматыўныя акты міністэрстваў і ведамстваў СССР і БССР.

Матэрыял сістэматызаван у адпаведнасці з праграмай па курсу «Савецкае грамадзянскае права».

В. а. рэдактара С. В. ГОВІН.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Заказ 1375.
Тыраж 2.000 экз. АТ 02456